Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-06-27

# На тым тыдні...

✓ **17 чэрвеня** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбыўся **вернісаж другой выстаўкі мастацкага праекта «Краявіды зямлі беларускай: Класікі беларускага жывапісу з прыватных збораў».** Пад час мерапрыемства прагучалі вершы Янкі Купалы і музычныя кампазіцыі на яго словы. Выстаўка працягнецца да 2 ліпеня.

✓ **18 чэрвеня** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылося **адкрыццё мастацкага праекта «Голос женщины в искусстве».** Творчая група «Лимбус» з пяці шведскіх жанчынаў-мастакоў (Ірына Хауска, Аніка Цёрн Легцінс, Алена Поруп, Анэтэ Андарсан, Сесілія Ліндбург) прадстаўляе фатаграфію, жывапіс і тэкстыльнае мастацтва.

✓ Тамсама **20 чэрвеня** ўрачыста адкрылі **выстаўку флуарэсцэнтнага дызайну і графікі** Кацярыны Лісіцынай і Алесі Філіпавай **«Люмін».**

Выстаўкі можна наведаць да 13 ліпеня.

✓ **20 чэрвеня** ў мінскім Палацы мастацтваў адначасова распачалі працу дзве **персанальныя выстаўкі – Юрыя Анушкі і Валянціны Іваньковай.** Пазнаёміцца з творчасцю майстроў можна да 7 ліпеня.

✓ **20 чэрвеня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа прайшло мерапрыемства **«І зноў была нядзеля, як тады, у сорак першым»**, прысвечанае 72-й гадавіне Вялікай Айчыннай вайны і 10-годдзю з дня смерці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Вечар памяці арганізаваны бібліятэкай сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. Імпрэза пачалася адкрыццём выстаўкі «Пайсці і вярнуцца» з фондаў бібліятэкі. На сустрэчы выступілі даследчыкі творчасці В. Быкава, прагучалі ўспаміны людзей, якія ведалі пісьменніка, сябравалі з ім. *Падрабязней – у наступным нумары.*

✓ **20 чэрвеня** Беларускі літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа зладзіў **літаратурную сустрэчу «Ты – песня натхнення»**, прымеркаваную да 100-годдзя шлюбу Якуба Коласа і Марыі Дзмітрыеўны. Малодшы сын песняра Міхась Міцкевіч, унукі і праўнукі падзяліліся ўспамінамі, прыгадалі цікавыя моманты з жыцця сям'і.

Адмыслова да 100-годдзя шлюбу была падрыхтаваная выстаўка з фондаў музея, матэрыялы якой распавядаюць пра каханне, сапраўдныя сяброўства і падтрымку, што панавалі ў сям'і песняра.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні